Стыпендыі Прэзідэнта маладым вучоным

Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі на 2014 год назначаны 90 таленавітым маладым вучоным. Адпаведнае распараджэнне кіраўнік дзяржавы падпісаў 21 студзеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

«Штомесячныя стыпендыі Прэзідэнта ў памеры Br3 млн назначаны 90 таленавітым маладым вучоным, у тым ліку 10 дактарам навук ва ўзросце да 45 гадоў, 47 кандыдатам навук ва ўзросце да 35 гадоў, 33 маладым вучоным без ступені ва ўзросце да 30 гадоў», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Агульныя інтарэсы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэта першая сустрэча, першае знаёмства, абмеркаванне таго, што нас збліжае. Мы прыйшлі да выніку, што ў нас агульныя мэты — стварацъ, — сказаў журналістам пасля сустрэчы Мітрапаліт Павел. — Нам няма ў чым спаборнічаць, у нас адзіны курс — на яднанне, росквіт народаў, заснаваныя на духоўна-маральных каштоўнасцях.

У сваю чаргу Рыгор Рапота адзначыў, што новы кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы — чалавек з вялікім вопытам у міжнароднай дзейнасці і служэння ў Расійскай Федэрацыі. «Мы сапраўды працуем над агульнымі задачамі, — пацвердзіў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы. — Таму мы дамовіліся, што будзем абменьвацца думкамі. І нават першы такі абмен паказаў, што рэлігія — тая сфера дзейнасці, якая фарміруе ідэалогію, унутраную свядомасць людзей, іх адносіны да ўсяго таго, што робіцца навокал. Таму я думаю, што добры сяброўскі сімбіёз узаемадзеяння будзе толькі на карысць развіццю Саюзнай дзяржавы.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, паведаміў, што гатовы прыняць беларускае грамадзянства, захаваўшы пры гэтым расійскае, каб юрыдычна пацвердзіць, што ён у Беларусі не дачаснік.

— Мне даводзілася служыць раней у розных краінах, у тым ліку ў ЗША і Ізраілі. Кожны раз Патрыярх накіроўваў мяне словамі, каб я служыў так, як быццам маё жыццё будзе ўсё прысвечана гэтаму месцу, — сказаў іерарх.

Мітрапаліт таксама ўдакладніў, што ён не намераны рабіць нейкія пераўтварэнні ці рэформы ў Беларускай царкве.

На пытанне аб мяркуемай колькасці людзей, якія прайшлі ўшанаваць агульную хрысціянскую святыню, якая зараз знаходзіцца ў Мінску, — Дары валхвоў, Экзарх адказаў: «Вынікі рабіць яшчэ рана, але думаю, лічба набліжаецца да 500 тысяч. Прыходзіць вельмі шмат людзей».

Ён таксама распавёў пра нядаўні выпадак вылечвання чалавека, які дакрануўся да святыні: «Літаральна ўчора мне вернікі расказвалі, як на іх вачах здзейснілася вылячэнне чалавека, якога можна назваць ашалелым. Ён падыходзіў да Дароў з жудасным жывёльным крыкам, не мог сам падысці, яго трымалі пяць здаровых мужчын. Пасля першага дакранання да святыні ён страціў прытомнасць. А пасля другога і трэцяга дакрананняў сваімі нагамі ў спакойным стане духу пайшоў».

Мітрапаліт падкрэсліў, што людзі, якія прыходзяць да Дароў, свае просьбы адрасуюць не самой рэлікві, а Богу, які благаславіў гэтую святыню сваім судакрананнем.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Дзеці адной зямлі

Свабода сумлення да многага абавязвае

Супрацоўніцтва дзяржавы і праваслаўнай царквы на ўсіх узроўнях працягнецца, каталіцкіх святароў-іншаземцаў стане менш, а супраць незаконнай дзейнасці «Сведкаў Іеговы» будуць прымаць меры.

Выніковая калегія апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Беларусі, на якой падводзіліся вынікі мінулага года, насамрэч ператварылася ў своеасаблівы «круглы стол», на пасяджэнні якога кампетэнтныя зацікаўленыя людзі абмяркоўвалі самыя злабадзённыя праблемы. Праблемы, якія, несумненна, хвалююць і ўсё наша шматнацыянальнае і шматканфесійнае (у невялікай Беларусі жывуць прадстаўнікі больш за 140 нацыянальнасцяў, дзейнічае 25 рэлігійных канфесій і кірункаў) грамадства. І галоўная апора мірнага існавання такіх розных людзей — раўнавага, роўнасць і паразуменне ў адносінах паміж імі і да іх. І клопат дзяржавы, органаў улады — гэтыя два паняцці забяспечыць.

Лекаваць і цела, і душу

Але гэта немагчыма зрабіць без падтрымкі і актыўнасці саміх нацыянальна-грамадскіх аб'яднанняў. Вядучыя канфесіі нашай краіны ідуць насустрач дзяржаўным органам і супрацоўнічаюць з імі. Ужо адзінаццаты год у нашай краіне паспяхова рэалізуецца праект, які Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка, без перабольшвання, назваў унікальным, — Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой. Да яго падключыліся фактычна ўсе міністэрствы, мясцовыя органы ўлады, і рэальныя набыткі гэтага супрацоўніцтва відаць ужо ў многіх сферах нашага жыцця.

Узяць, напрыклад, Дом міласэрнасці ў Мінску, які знаходзіцца ва Усіхсвяцкім прыходзе. Гэта фактычна першы сумесны сацыяльны праект. У Доме міласэрнасці могуць знайсці прытулак і догляд нямоглыя і старыя людзі. Штогод тут аздараўляецца больш за 200 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Даглядаюць іх жанчынкі з сястрынства прыхода.

І такі прыклад не адзінкавы. У тым жа Мінску, паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і справах моладзі Мінгарвыканкама Сяргея Хільмана, у 23 праваслаўных прыходах ёсць спецыяльныя супрацоўнікі, якія адказваюць за сацыяльнае служэнне. У прыходзе іконы «Усіх Тужлівых Радасць» маладыя інваліды могуць авалодаць прафесіяй швяі і сталяра, навучыцца працаваць на камп'ютары. У Свята-Елізавецінскім манастыры добрым словам і малітвай лечаць душы тых, хто асмеліўся на суіцыд. Члены рэлігійных суполак пры сталічных храмах працуюць у бальніцах, у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

І гэта не толькі ў Мінску. У невялікім Дрыбінскім раёне на Магілёўшчыне праваслаўныя святары працуюць сумесна з праваахоўнікамі. Намеснік старшыні райвыканкама Дзмітрый Пімашэнка прывёў такую лічбу: з 270 сустрэч, што супрацоўнікі міліцыі правялі летась з п'яніцамі і іншым праблемным кантынгентам, у 50 прынялі ўдзел прадстаўнікі царквы. Вынік відавочны: у раёне знізілася колькасць ужывання спіртнога, павялічылася нараджальнасць. Проста супадзенне? Наўрад ці. Прынамсі, Леанід Гуляка, які нядаўна быў у Дрыбіне і на свае вочы бачыў, як вядзецца работа, так не лічыць. Гэта вынік рэальнага супрацоўніцтва тых, хто можа прымаць пэўныя меры, і тых, хто можа закрануць душу і сумленне.

Прыярытэты супрацоўніцтва ў межах пагаднення паміж дзяржавай і БПЦ захаваюцца і надалей, перакананы Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. На гэта ёсць усе падставы і напрацоўкі.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

■ Сочы-2014

УДАЧЫ, АЛІМПІЙЦЫ!

Крыху больш за два тыдні засталося да старту Алімпійскіх гульняў у Сочы. Склады камандаў абвешчаны, дэлегацыя, куды ўвайшлі трэнеры, медыцынскі персанал, журналісты і афіцыйныя асобы, сфарміравана, а беларускія спартсмены на ўсю моц рыхтуюцца да самых важных спаборніцтваў чатырохгоддзя. Дарэчы, нашы атлеты прымуць удзел у пяці відах алімпійскай праграмы — біятлоне, фрыстайле, лыжных гонках, горных лыжах і шорт-трэку.

Зразумела, што медальныя надзеі ўсіх беларусаў перш за ўсё звязаны з жаночай зборнай па біятлоне і мужчынскай камандай па фрыстайле. Гэта пацвердзіў і першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Ігар Рачкоўскі. «Апошнія вынікі беларускіх біятланістак і фрыстайлістаў дазваляюць разлічваць на поспех у Сочы. І ўсе магчымасці для выдатнага выступлення нашых спартсменаў на Алімпіядзе выкарыстаны ўжо даўно. Некаторыя атлеты, сярод якіх Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна, не так даўно прайшлі функцыянальнае абследаванне ў адной з лепшых клінік Ізраіля. Акрамя гэтага, былі вырашаны ўсе пытанні па экіпіроўцы, харчаванні, зборах і фармакалогіі. Дарэчы, наконт апошняга… Медыкаменты спартсменам выдзяляліся не па нормах, а па неабходнасці. Дзеля гэтага сродкі выдаткоўваліся па лініі Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Прэзідэнцкага спартыўнага клуба і спартыўных федэрацый. Шчыра кажучы, Алімпійскія гульні ў Сочы, напэўна, першыя за дваццацігадовую гісторыю (упершыню Беларусь прыняла ўдзел у зімовай Алімпіядзе ў 1994 г. — **Аўт.**), калі ні ў спартсменаў, ні ў трэнераў не ўзнікла ніякіх нараканняў па падрыхтоўцы».

Наўрад ці варта вызначаць мяркуемую колькасць медалёў, якую здольныя прывезці з Сочы нашы спартсмены, бо спорт — з'ява непрадказальная. Так, Максім Рыжанкоў, памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму, быў акуратным у прагнозах і сказаў, што па меншай меры 10 беларускіх спартсменаў могуць трапіць у васьмёрку лепшых. А Ігар Рачкоўскі дадаў, што перад атлетамі ніхто не выказваў жорсткіх патрабаванняў, і той праславуты план у пяць алімпійскіх медалёў — усяго толькі прагноз Міжнароднага рэйтынгавага агенцтва, а не загад Міністэрства спорту. «Для нашых алімпійцаў цяпер вельмі важна, каб мы стварылі вакол іх камфортную, прыемную атмасферу, — адзначыў Ігар Анатольевіч. — Яны і так адчуваюць неверагодную адказнасць, і дадатковы прэсінг тут не патрэбны. Давайце лепш пажадаем нашым спартсменам поспехаў і ўдачы!»

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Фота БЕЛТА.

■ З нагоды

ІМПЕРАТЫЎ МАДЭРНІЗАЦЫІ

Размова Прэзідэнта з кіраўнікамі вядучых сродкаў масавай інфармацыі была арыентавана на абмеркаванне ключавых праблем беларускага грамадства. Сярод іх, безумоўна, асаблівае месца займае мадэрнізацыя

Па сутнасці, большая частка таго, што казаў Аляксандр Лукашэнка, мела дачыненне да мадэрнізацыі ў шырокім яе разуменні (напрыклад, рэформа сістэмы праваахоўных органаў, рэформы ў спорце і гэтак далей). Але ўвага была ўдзелена і непасрэдна пытанням эканамічнай мадэрнізацыі, ад рашэння якіх для Беларусі залежыць сапраўды многае.

Першы тэзіс Прэзідэнта: мадэрнізацыя — гэта правільна і неабходна нават ва ўмовах крызісу. Мадэрнізацыя застаецца найважнейшым імператывам эканамічнай палітыкі. Таму што так і толькі так беларусы могуць зарабіць на годнае жыццё, а Беларусь — здзейсніцца, як суверэнная дзяржава. Крызіс — гэта толькі падстава для таго, каб працаваць хутчэй і больш эфектыўна.

Другі тэзіс: змяняецца падыход да арганізацыі мадэрнізацыі, яе метадалогія. Па-ранейшаму перад кожным кіраўніком прадпрыемства стаіць задача распрацаваць і рэалізоўваць план мадэрнізацыі. Аднак дзяржава будзе падтрымліваць сваім рэсурсам толькі тыя праекты і планы мадэрнізацыі, якія абяцаюць рэальную выгаду ў перспектыве 3–4 гадоў.

Трэці тэзіс: важнай задачай эканамічнай мадэрнізацыі Беларусі з'яўляецца забеспячэнне дыверсіфікацыі яе эканомікі, як у плане крыніц сыравіны, так і ў плане рынкаў збыту. Максімальны акцэнт — на тых вытворчасцях, якія выкарыстоўваюць мясцовую сыравіну (перш за ўсё, лес, будаўнічыя матэрыялы). І пры гэтым — пошук новых рынкаў збыту, альбо самастойны, альбо арганізаваны нашымі партнёрамі ў сумесных інтарэсах.

Прыкладам апошняга можна лічыць стварэнне ў Беларусі сумеснага з кітайскай кампаніяй Geely зборачнай вытворчасці легкавых аўтамабіляў. З аднаго боку, гэта праект імпартаёмкі, цалкам заснаваны на імпарце камплектуючых і тэхналогіі. З іншага боку, аб'ёмныя ўкладанні ў гэты праект кітайскага боку дазваляюць спадзявацца на падтрымку КНР ў пытанні пошуку рынкаў збыту для аўтамабіляў, якія будуць вырабляцца ў Беларусі. А дамагчыся большай ступені лакалізацыі тэхналагічнага працэсу ў Беларусі можна на больш позніх этапах рэалізацыі праекта.

Нарэшце, ёсць і чацвёрты тэзіс — аб мадэрнізацыі канкрэтных галін, карэнным пераглядзе схем кіравання і арганізацыі працы ў іх. У 2014 годзе такі лёс чакае сельскую гаспадарку і жыллёва-камунальную гаспадарку. Мэта ў сферы ЖКГ — забяспечыць празрыстасць фармавання тарыфаў, як для ўлады, так і для насельніцтва. Пры гэтым самі тарыфы будуць працягваць свой рост з улікам павышэння даходаў насельніцтва для таго, каб з цягам часу ўсе выдаткі на жыллёва-камунальныя паслугі пакрываліся аплатай грамадзян. З аднаго боку, гэта, вядома, павялічвае нагрузку на насельніцтва. Але з іншага боку, гэта дазваляе фінансава «разгрузіць» прадпрыемствы, зрабіць іх больш канкурэнтаздольнымі, а значыць — забяспечыць павышэнне ўзроўню даходаў людзей.

У сельскай гаспадарцы стаіць іншая, але не менш канкрэтная і складаная задача — выйсці на фінансава заможную мадэль працы гэтай сферы. Аляксандр Лукашэнка сфармуляваў яе так: «Я хачу разабрацца. Гэтых грошай, якія мы ўклалі ў мадэрнізацыю ўсяго комплексу — ад сельскай гаспадаркі і перапрацоўкі да рэалізацыі, дастаткова ці працягваць падтрымліваць у такім плане? Шмат гэта ці мала? А вынікі трэба яшчэ суаднесці з гэтымі выдаткамі. Гэта значыць настаў час разабрацца, якая там сітуацыя, і прымаць далейшыя рашэнні: ці ж мы сельскую гаспадарку падтрымліваем, як падтрымлівалі, або іх трэба сёння нахіліць на ўсю катушку, каб яны зараблялі грошы самі».

Сёння дзяржава за кошт нізкіх закупачных цэн на сельгаспрадукцыю забяспечвае адносна нізкі кошт сыравіны для харчовай прамысловасці і, адпаведна, рэгулюе цану на сацыяльна значныя прадукты харчавання. Прэзідэнт, па сутнасці, задаецца пытаннем аб тым, наколькі мэтазгодна захаванне такой мадэлі. Ці не лепш адпусціць цэны, забяспечыць прыбытковасць сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прымусіць спажыўца плаціць больш, але пры неабходнасці — фінансава падтрымаць сацыяльна неабароненыя слаі насельніцтва? З іншага пункту гледжання — а што ў такім выпадку будзе з рэнтабельнасцю харчовай прамысловасці? Верагодна, у 2014 годзе сітуацыя будзе вывучана дэталёва і будзе прынята рашэнне па гэтым пытанні.

Такім чынам, у гутарцы з кіраўнікамі сродкаў масавай інфармацыі Прэзідэнтам быў прадстаўлены накід цэласнай эканамічнай праграмы, выбудаванай з улікам вельмі няпростых знешнеэканамічных абставінаў, у якіх знаходзіцца Беларусь. І ў цэнтры гэтай праграмы — уяўленне пра мадэрнізацыю, якая павінна мець татальны характар, але пры гэтым звышінтэнсіўна прасоўвацца наперад па некалькіх ключавых, найбольш эфектыўных кірунках.

Юрый ЦАРЫК